Аксюцік М.І.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## ЭКАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ

90-я гады XX стагоддзя аб'яўлены ЮНЕСКА дзесяцігоддзем аховы навакольнага асяроддзя. У сувязі з гэтым праблема ўсебаковай экалагічнай адукацыі людзей набывае надзвычайную актуальнасць. На Беларусі сістэма экалагічнага выхавання толькі пачынае фарміравацца. Больш паспяхова гэты працэс ідзе ў тэхнічных навучальных установах розных узроўняў, навучэнцы якіх у сваіх прафесійных сферах непасрэдна сутыкаюцца з эксплуатацыяй прыродных рэсурсаў.

У сістэме гуманітарных навучальных установаў, як сведчаць вынікі шэрагу міжнародных навукова-практычных канферэнцый апошніх гадоў, пытанні экалагічнай адукацыі навучэнцаў і студэнтаў знаходзяцца толькі ў стане пастаноўкі. У лепшым выпадку дзе-нідзе захаваны абстрактныя курсы тыпу "Ахова прыроды" альбо ўведзены вузкаспецыяльныя, як, напрыклад, "Радыяцыйная бяспека" пад шыльдай курса экалогіі. Між тым сусветным вопытам вышэйшай гуманітарнай адукацыі назапашаны багатыя веды ў напрамку культуралагічных аспектаў экалагічных праблем, сфарміравана такая навука, як сацыяльная экалогія.

У сувязі са сваёй спецыфікай вельмі важкую ролю ў масавым экалагічным выхаванні насельніцтва можа адыграць універсітэт культуры. Пераход на двухузроўневую падрыхтоўку спецыялістаў, вядома, паспрыяе гэтаму працэсу. На першай ступені навучання студэнты ўсіх спецыялізацый могуць атрымаць агульныя веды па курсу "Экалогія і культура", дзе будуць разгледжаны гуманістычныя аспекты глабальнай праблемы "чалавек-прырода", пытанні станаўлення экалагічнай свядомасці асобы, гісторыка-культурныя шляхі фарміравання гарманічных суадносін чалавека і прыроды.

На другой ступені пры вывучэнні блока спецыяльных дысцыплін студэнты авалодваюць канкрэтнымі методыкамі экалагічнага выхавання людзей праз арганізацыю шырокай экалагічнай асветы і канкрэтную экалагічную дзейнасць у шматлікіх аматарскіх аб'яднаннях (клубы хатніх жывёл, птушак, акварыумных рыб і г.д.). Усё гэта будзе не вельмі складана, таму што кожны наш выпускнік рыхтуецца да працы з масавай аўдыторыяй і мае асноўнай мэтай сваёй прафесіі асветніцкую дзейнасць у шырокім сэнсе гэтага слова.

У Беларускім універсітэце культуры ўжо маецца пэўны вопыт гэтай работы, аднак ён тычыцца вузкага кола студэнтаў спецыялізацыі "мэнеджэр сацыякультурнай сферы", што яўна недастаткова, таму што вышэйшая універсітэцкая адукацыя сёння ва ўсім свеце не ўяўляецца паўнацэннай без экалагічнай адукацыі.

Гусеў Ю.А.,
докт.філас.навук
Майсейчук С.Б.,
аспірантка

## ДА ПЫТАННЯ АБ НАВУКОВЫХ АСНОВАХ КІРАВАННЯ ТВОРЧЫМІ КАЛЕКТЫВАМІ

1. Праблемы навуковага кіравання рознымі працэсамі натуральнай і ненатуральнай прыроды набываюць усё большую актуальнасць і значнасць. Гэта абумоўлена шматлікімі абставінамі гнасеалагічнага, праксіалагічнага і сацыяльнага характару. У гэтай сувязі ўзнікаюць пытанні: ці магчыма кіраванне творчай дзейнасцю на індывідуальным альбо калектыўным узроўні і якая ступень гэтай магчымасці?

Вядома, што творчасць уключае сукупнасць такіх рыс, як непрадказальнасць свайго праяўлення, нечаканасць і сацыяльна-псіхалагічную рызыку. Вынік творчых намаганняў можа атрымаць неадэкватную ацэнку з боку дзяржавы, палітыкаў, тых ці іншых структур. Нам вядомы з мінулага выпадкі скарыстання рэпрэсіўных мер як у адносінах да канкрэтных асоб і творчых калектываў, так і да вынікаў іх працы. Такі метад кіравання быў шырока распаўсюджаны ва ўмовах таталітарнага рэжыму. Гэты метад не мае нічога агульнага з навуковасцю і заслугоўвае рашучага асуджэння.

2. Мы лічым, што любы сацыяльны працэс, у тым ліку і творчы, мае патрэбу не толькі ў самарэгуляцыі, карэкціроўцы самім суб'ектам, але і ў больш дакладным сэнсе слова кіраванні

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

з боку грамадскіх і дзяржаўных арганізацый. У гэтай сувязі важна раскрыць змест тэрміна "кіраванне" ў галіне культуратворчасці, яго функцыянальнага характару, высвятліць якаснае адрозненне кіравання ў матэрыяльнай і духоўнай сферах.

Кіраванне нельга разумець у літаральным сэнсе слова як умяшанне ў творчы працэс, падпарадкаванне ўсіх яго элементаў нарматыўным патрабаванням, як сацыяльна-палітычны кантроль над стварэннем твораў мастацтва, іх выкананнем, складаннем праграм, адборам выканаўцаў і г.д.

3. З пункту гледжання асноў навуковага кіравання мастацкімі калектывамі патрабуюцца перш за ўсё глыбокія веды іх асаблівасцей, творчага патэнцыялу, функцыянальнай накіраванасці, прафесійнай падрыхтоўкі, сацыяльных умоў дзейнасці і іншага, што характарызуе той ці іншы калектыў як адзінае цэлае.

Такім чынам, кіраванне як сацыякультурны працэс у сваёй сутнасці мае на ўвазе мэту кваліфікаванай дапамогі, накіраванай на выяўленне ў поўнай меры творчага патэнцыялу калектыву, яго узбагачэнне за кошт стварэння найбольш спрыяльных сацыяльна-эканамічных і творчых умоў. Пры гэтым не трэба забываць аб сацыяльнай абароне творчай асобы і гарантыях творчай свабоды. Сапраўднае навуковае кіраванне павінна выключаць нівеліраванне творчай індывідуальнасці, прымус, канфармізм, сацыяльна-творчы стрэс, пачуццё страху за няўдачы на творчым шляху.

4. Неабходна перасцерагчы ад разумення кіравання як працэсу, што выключае супярэчнасці і памылкі ў кіраванні. Кіраванне творчымі калектывамі дапускае прысутнасць эўрыстычнага, пошукавага фактару, а гэта патрабуе прызнання як прамой, так і адваротнай сувязі. Адваротная сувязь дапамагае пераканацца ў эфектыўнасці альбо памылковасці кіраўнічых дзеянняў, высвятліць пэўныя праблемы, што дазваляе ўносіць карэктывы ў гэтыя дзеянні, ажыццяўляць перабор варыянтаў. Гэта тым больш неабходна, паколькі калектыў не стаіць на месцы, ён развіваецца, змяняе праграму альбо характар сваёй творчай дзейнасці, а часам тое і другое адначасова.

Намі закрануты толькі некаторыя аспекты навуковых асноў кіравання калектыўнай творчай дзейнасцю. Яна ў перспектыве сустрэнецца з больш сур'ёзнымі, чым зараз, цяжкасцямі, выкліканымі рыначнымі адносінамі. Культура можа выжыць ва ўмовах рынку, калі сістэма кіравання набывае якасна новыя рысы, якія дазваляюць не толькі захаваць яе чалавекатворчы сэнс, але і збагаціць змест.

Бірукова Т.П.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА КУРСУ "АСНОВЫ СЦЭНАРНАГА МАЙСТЭРСТВА"

Стратэгія інтэнсіфікацыі і перабудова ўсіх сфер сацыяльнай практыкі запатрабавалі зусім новага падыходу да навучання спецыяліста з вялікім творчым патэнцыялам, мастацка-творчым уяўленнем і асаблівымі псіхарацыялагічнымі ўласцівасцямі асобы.

Арганічнай састаўной часткай прафесійнай падрыхтоўкі сацыяльнага педагога па арганізацыі вольнага часу з'яўляецца авалоданне такім шматпланавым і творчым прадметам, як драматургія разнастайных культурных праграм.

Напісанне сцэнарыя - заўсёды творчы працэс, які патрабуе не толькі валодання "тэхналагічнымі" сакрэтамі, але які дае і магчымасць праяўлення асабістых пазіцый самога аўтара. Найбольшая складанасць заключаецца ў тым, каб студэнт зразумеў зыходнае палажэнне ў гэтым працэсе: любая культурная праграма прадугледжвае дзеянне, якое развіваецца ці ў рамках сюжэта, ці існуе без яго. Уменне пабудаваць гэта дзеянне, укласці ў яго драматургічную насычанасць, каб уцягнуць у дзеянне актыўнага ўспрымання аўдыторыю, складае сэнс паняцця "драматургія культурных праграм па арганізацыі вольнага часу".

Задача курса "Асновы сцэнарнага майстэрства" заключаецца ў тым, каб сфармаваць у будучага сацыяльнага педагога неабходныя ўменні ў драматургічнай арганізацыі матэрыялу, навучыць яго творча вырашаць кожную пастаўленую задачу: хай гэта будзе дзіцячае сямейнае свята, сямейна-гульнявыя конкурсы, кірмашы па продажы цацак ці формы сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі дзяцей, дарослых і г.д.

У дадзеным выпадку мы зыходзім з трох палажэнняў. Па-першае, кожны студэнт у сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ